Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЧЭРВЕНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 100 (25965)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

# ТАЛЕНАВІТАЯ МОЛАДЗЬ — НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗДАБЫТАК КРАІНЫ

**У Беларусі створаны ўсе ўмовы для развіцця здольнасцяў і талентаў маладых людзей. Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 31 мая на традыцыйнай штогадовай сустрэчы з навучэнцамі — пераможцамі міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў, таленавітай моладзі.**


Фота БЕЛТА.

За 11 гадоў існавання спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў фінансавую падтрымку атрымалі больш як 14 тыс. вучняў, студэнтаў, выкладчыкаў і іншых асоб, якія ўнеслі асабісты ўклад у работу з таленавітай моладдзю.

Па даручэнню кіраўніка дзяржавы ў 2005 годзе былі створаны банкі даных лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльных прэзідэнцкіх фондаў па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў, таленавітай моладзі. Лёс уключаных у іх маладых людзей пастаянна адсочваецца. Звесткі аб іх перадаюцца наймальнікам — кіраўніцтву буйных айчынных кампаній, дырэктарам дзяржаўных прадпрыемстваў. Гэта стварае неабходныя ўмовы для рэалізацыі патэнцыялу таленавітай моладзі ў нашай краіне.

Зараз па ўсёй краіне праводзіцца вялікая работа па стварэнню ўмоў для інтэлектуальнага, фізічнага і духоўнага развіцця падрастаючага пакалення. Адораным дзецям удзяляецца асаблівая ўвага як з боку кіраўніцтва дзяржавы, так і грамадскіх арганізацый. Аб гэтым, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сведчыць паспяховая рэалізацыя праграмы «Маладыя таленты Беларусі».

Больш як палавіна школьнікаў ахоплены рознымі формамі дыферэнцыраванага навучання. Для іх адкрыты дзверы 165 гімназій і 36 ліцэяў. Працуюць шматлікія профільныя класы і класы з паглыбленным вывучэннем асобных дысцыплін.

Больш як паўмільёна юнакоў і дзяўчат штогод прымаюць удзел у рэспубліканскай прадметнай алімпіядзе. Нашы каманды выдатна выступаюць на міжнародных алімпіядах і турнірах. З 1990 па 2006 год 286 беларускіх школьнікаў заваявалі медалі гэтых прэстыжных спаборніцтваў.

Як адзначыў Прэзідэнт, сёння ў Беларусі працуе больш як паўтысячы дзіцячых школ мастацтваў, творчыя ВНУ, вучылішчы і каледжы, ствараюцца дзяржаўныя прадзюсарскія цэнтры ў Мінску і абласцях. У мінулым годзе больш як 200 юных талентаў сталі лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў.

Аляксандр Лукашэнка назваў значнымі творчымі дасягненнямі выступленні Андрэя Кунца і Дзмітрыя Калдуна на конкурсах песні «Еўрабачанне». «Беларускія канкурсанты праявілі не толькі талент, але і выдатную прафесійную падрыхтоўку, і самае галоўнае — сапраўдны байцоўскі характар. Іх выступленні спадабаліся мільёнам людзей не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што поспехі моладзі знаходзяць прызнанне на самым высокім дзяржаўным узроўні. У 2006 годзе заахвочванні спецыяльных фондаў Прэзідэнта атрымалі больш як 1700 навучэнцаў, студэнтаў, выкладчыкаў і вучоных, больш за 200 прадстаўнікоў творчай моладзі і 18 мастацкіх калектываў.

Дзейнасць спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі накіравана на выхаванне будучай творчай эліты беларускай нацыі. На гэтыя мэты ў 2006 годзе было выкарыстана Br677 млн, у тым ліку Br274 млн — на выплату стыпендый, прэмій, гранд-прэмій і іншых відаў адрасных заахвочванняў. Усяго ў мінулым годзе падтрымку фонду атрымалі 223 чалавекі і 18 мастацкіх калектываў, у тым ліку звання лаўрэата ўдастоены 39 таленавітых юнакоў і дзяўчат, 8 калектываў.

На думку Прэзідэнта, здабытак народа вызначаецца ў першую чаргу яго творчым патэнцыялам, здольнасцю ствараць культурныя каштоўнасці, дынамічна развіваць навуку і вытворчасць. Звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы, ён падкрэсліў: «Вашы поспехі і ваш талент — гэта нацыянальны здабытак, сапраўдны залаты запас краіны».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у духоўным і інтэлектуальным развіцці нацыі неацэнная роля падзвіжнікаў сваёй справы, сапраўдных патрыётаў. «Адзначаючы сёння поспехі нашай моладзі, мы аддаём даніну павагі вашым здольнасцям і верым у дастойны працяг шляху да высокага майстэрства і служэння сваёй Айчыне», — сказаў ён. Прэзідэнт заклікаў адораных навучэнцаў і студэнтаў з павагай адносіцца да старэйшых таварышаў і настаўнікаў, якія дапамаглі пракласці дарогу да перамогі, а таксама не паддавацца «зорнай хваробе». «Помніце, што талент — гэта 10 працэнтаў прыроднага таленту і 90 працэнтаў працы. Толькі пастаянная работа над сабой, няспыннае прафесійнае ўдасканаленне дапамогуць вам дасягнуць сапраўдных вышынь у выбранай сферы дзейнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён заявіў, што абавязак дзяржавы — быць надзейнай апорай адоранаму чалавеку на яго шляху да поспеху. Бо чым больш сродкаў мы будзем укладваць у культуру і навуку сёння, тым больш дастойна мы будзем жыць заўтра, сказаў Прэзідэнт.

«Беларусь любіць вас і паважае, я вельмі спадзяюся, што гэта любоў будзе ўзаемная. Працуйце на карысць любімай Радзімы — іншай у вас не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў навучэнцаў і студэнтаў са знамянальнай падзеяй у іх жыцці і ўручыў ім пасведчанні і нагрудныя знакі лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў, таленавітай моладзі, а таксама Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пасля цырымоніі адбыўся канцэрт лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Чачэрск — горад блізнят і двайнят. У першай школе горада вучыцца ажно пяць такіх пар: першакласніцы Настасся і Людміла ПЕНЯЗЬКОВЫ, чацверакласніцы Алена і Вольга БУЛКА, пяцікласнікі Ілья і Аляксей ЧЫГРЫНЦЫ, васьмікласніцы Святлана і Марына РЫБЦОВЫ і Аксана і Марына АНДРЫЯНАВЫ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПРЭЗІДЭНТАМ ЛАТВІІ АБРАНЫ ТРАЎМАТОЛАГ

**У чацвер дэпутаты латвійскага сейма абралі новага прэзідэнта рэспублікі. Ім стаў 52-гадовы ўрач-траўматолаг Валдзіс Затлерс. Як паведаміла Інтэрнэт-выданне NovoNews, за яго кандыдатуру прагаласавалі 58 парламентарыяў, а за яго саперніка — суддзю Айвара Эндзіньша — 39. Колькасць набраных галасоў дало Затлерсу права стаць прэзідэнтам без другога тура выбараў.**

Паўнамоцтвы цяперашняга прэзідэнта Латвіі — Вайры Віке-Фрэйбергі заканчваюцца 7 чэрвеня, і яна не мае права на перавыбранне. Цікава, што перад выбарамі Затлерсу ставілі ў віну «грошы ў канвертах», які той быццам бы браў, будучы ўрачом, а Эндзіньшу ўзгадалі яго камуністычнае мінулае. У чацвер у ходзе дэбатаў у сейме выказваліся думкі, што «перадвыбарная кампанія» ў адносінах да абодвух кандыдатаў будавалася на ачарненні і крытыцы. Прэзідэнт Латвіі выбіраецца парламентам краіны на чатыры гады.



Добрая навіна

# Жыллёвыя ўмовы палепшылі амаль 13 000 маладых сем'яў

**У Беларусі ў 2006 годзе палепшылі свае жыллёвыя ўмовы 12 756 маладых сем'яў, якія стаяць на ўліку на паляпшэнне гэтых умоў. Аб гэтым паведаміла на пасяджэнні «круглага стала» «Вырашэнне жыллёвых праблем маладых сем'яў, паляпшэнне жыллёвых умоў: рэаліі і перспектывы» галоўны спецыяліст упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Мар'яна Еўтушэнкава.**

Паводле яе даных, усяго ў мінулым годзе палепшылі свае жыллёвыя ўмовы 34 тыс. 12 сем'яў, што складае 5,5 працэнта колькасці ўсіх тых, хто мае патрэбу. У прыватнасці, па горадзе Мінску на ўліку стаялі 89 387 маладых сем'яў, палепшылі свае жыллёвыя ўмовы — 1 тыс. 339 сем'яў, або 1,5 працэнта. Усяго ж на 1 студзеня 2007 года на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаялі 623 тыс. сем'яў, што на 10 працэнтаў больш, чым на 1 студзеня 2006 года, з іх маладых сем'яў — 295 782 тыс., або на 15 працэнтаў больш.

Як адзначыла Мар'яна Еўтушэнкава ў размове з карэспандэнтам БЕЛТА, колькасць тых, хто стаіць на чарзе, павялічваецца. Гэта тлумачыцца тым, што Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у сілу з ліпеня 1999 года, значна пашырыў падставы, па якіх грамадзяне могуць стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У іх ліку павелічэнне нормы агульнай плошчы да 15 кв.м, пры якой грамадзянін мае права стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама прадастаўленне магчымасці стаць на ўлік маючым патрэбу грамадзянам, якія ўпершыню ўзялі шлюб і не маюць уласнага жылля без уліку існуючага жылля ў бацькоў.

Каб зрабіць жыллё больш даступным для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пачынаючы з 2007 года забяспечваецца паэтапнае павелічэнне долі будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў для гэтай катэгорыі. Плануецца, што гэты паказчык да 2010 года будзе даведзены да ўзроўню не менш як 80 працэнтаў ад аб'ёму ўводу такіх дамоў у гарадах. Так, у 2007 годзе ў цэлым па краіне плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 4 700 тыс. кв.м агульнай плошчы жылых памяшканняў, з іх 3 333 тыс. кв.м (71 працэнт ад агульнага аб'ёму) будзе пабудавана для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**БЕЛТА.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже следующего имущества:

| № лота | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Автомобиль легковой «ГАЗ 3110», седан | 1998 | 3 022 797 |
| 2. | Автомобиль грузовой «ИЖ 271501», фургон | 1992 | 758 996 |
| 3. | Автомобиль грузовой «ЗИЛ 130», фургон (разукомплектован) | 1980 | 697 400 |
| 4. | Автомобиль грузовой «МАЗ 55371», фургон тентовый | 1992 | 8 673 922 |
| 5. | Автомобиль грузовой «ГАЗ 3307 ГЗСА 891», фургон | 1992 | 2 162 427 |
| 6. | Автомобиль грузовой «ГАЗ 3307», фургон | 1993 | 2 300 454 |

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата объекта производится победителем аукциона в течение 30 дней со дня проведения торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 05.07.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.07.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### У ВЫХАДНЫЯ — ДОЎГАЧАКАНАЯ ПРАХАЛОДА

**Даволі цёплае і вільготнае паветра з боку Чорнага мора прынясе сёння ўдзень месцамі кароткачасовыя дажджы і моцныя навальніцы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. Пры навальніцах чакаюцца моцныя парывы ветру. Тэмпература паветра 23—29, па паўднёваму захаду — да 31 градуса цяпла.**

У выхадныя характар надвор'я істотна зменіцца. Цёплае вільготнае паветра з тэрыторыі нашай краіны пачне выціскацца на поўдзень Еўропы Скандынаўскім антыцыклонам. Вецер зменіцца на паўночны. У суботу ў многіх раёнах пройдуць дажджы, часам з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 10 градусаў на поўначы да 20 — на поўдні. Удзень чакаецца 19—25 градусаў, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 29 градусаў.

У нядзелю дажджы чакаюцца толькі ў паўднёвай частцы краіны. Тэмпература паветра істотна не зменіцца.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у пачатку наступнага тыдня дажджы будуць толькі па паўднёваму захаду Беларусі. Тэмпература паветра ўначы 9—14 градусаў цяпла, удзень 21—26. Аднак дзённая тэмпература паветра пачне павялічвацца: ужо ў сераду чакаецца да 23—28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ГАРЭЛКА ПАДАРАЖЭЛА

**У Беларусі з канца мая павысіліся на 1,5 працэнта розничныя цэны на гарэлку ў стандартнай шкляной тары.**

Як адзначаюць у Міністэрстве эканомікі краіны, адпаведнае рашэнне прынята пастановай ад 28 мая № 104 «Аб цэнах на алкагольную прадукцыю» і тлумачыцца падаражэннем сыравіны і ростам акцызнага падатку ў другім квартале гэтага года. Дарэчы, таксама на 1,5 працэнта павялічыліся мінімальныя адпускныя цэны на алкагольную прадукцыю моцнасцю звыш 28 працэнтаў, адпускныя цэны на спірт этылавы сырэц і спірт этылавы рэктыфікаваны выраслі на 5 працэнтаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### БЕЛАРУСКАЯ ПОШТА — ЛЕПШАЯ

**Нядаўна паштовым службам Беларусі, Германіі і Венгрыі былі ўручаны пасведчанні вышэйшай якасці і прэміі па выніках аказання імі паслуг. Такое рашэнне было прынята Сусветным паштовым саюзам.**

Нагадаем, праграма сертыфікацыі Сусветнага паштовага саюза (СПС) была заснаваная ў 2003 годзе. Яна накіравана на ўшанаванне тых паштовых аператараў, якія выкарыстоўваюць працэдуры кіравання якасцю ў сваіх структурах, гарантуюць выкананне асабліва высокіх стандартаў пры аказанні міжнародных паслуг, а таксама прымаюць актыўны ўдзел у праграмах павышэння якасці. Яшчэ раней узнагароды СПС атрымалі Швейцарыя, Данія, Іарданія і шэраг іншых краін.

Гэта ўзнагарода ўяўляе сабой міжнароднае прызнанне намаганняў, зробленых паштовымі прадпрыемствамі Беларусі для дасягнення сусветных стандартаў якасці, па забеспячэнню патрэбнасцяў кліентаў, інвестыцый у яе структуры і персанал.

**Леанід ТУГАРЫН.**

### ЗА НЯПЛАТУ — ВЫСЯЛЕННЕ!

**За няплату камунальных плацяжоў гараджане змогуць пазбавіцца сваіх кватэр. Так, у Ленінскім раёне сталіцы сёння ўжо тром сем'ям пагражае перасяленне з уласных кватэр у іншыя — меншыя па плошчы.**

Як расказала юрысконсульт ЖРЭА Ленінскага раёна Таццяна Лявіцкая, гэтыя мінчане не аплочваюць рахункі за камунальныя паслугі ўжо больш за паўгода. Усяго ў судзе Ленінскага раёна знаходзіцца сёння 417 іскаў ад ЖРЭА на спагнанне з жыльцоў нявыплачаных камунальных плацяжоў. Агульная запазычанасць па раёну — больш за мільярд рублёў. Нагадаем, што ў мінулым годзе ў раёне адна сям'я злосных неплацельшчыкаў была пераселеная ў кватэру меншай плошчай, а яшчэ дзве — выселены без прадастаўлення іншага жылля.

**Настасся САМУСЕНКА,** *«Мінск-Навіны».*

### ЗЛАДЗЕІ «ДАІЛІ» АЎТАМАБІЛІ

**У Мінску на праспекце газеты «Звязда» міліцыянеры затрымалі дваіх «паляўнічых» на чужое паліва.**

Паводле слоў намесніка камандзіра 3-й роты палка патрульна-паставой службы ГУУС Мінгарвыканкама Сяргея ГАЛІЗІНА, інфармацыя аб асобах, якія, «ўзброіўшыся» каністрамі і гумавымі шлангамі, «церліся» вакол прыпаркаваных на вуліцы машын, паступіла міліцэйскаму нараду ноччу. Вартавыя правапарадку тэрмінова выехалі на пошукі магчымых зламыснікаў. У двары аднаго з дамоў міліцыянеры заўважылі аўтамабіль «Жыгулі» і дваіх падазроных грамадзян. Хутка высветлілася, што гэтыя малойцы «даілі» прыпаркаваныя на вуліцы аўтамабілі. Міліцыянеры знайшлі ў багажніку «Жыгулёў» і «зброю» злачынства — гумавыя шлангі і каністры. Каністры і бак «легкавушкі», куды зладзеі злівалі здабычу, між іншым, былі запоўненыя пад гарлавіны. Усяго двое зладзеяў «выпампавалі» амаль 120 літраў бензіну. Супраць ахвочых да чужога паліва ўзбуджана крымінальная справа.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# ДАР ПАЛАЧАНКІ Нінэль Шчаснай

## Сёння ў Полацку адкрываецца пастаянна дзеючая выстаўка Нінэль Шчаснай. Мастачка перадае ў родны горад 50 работ

**...За больш чым дзвюхгадзінную размову мы ні разу не прыселі. Гэта быў своеасаблівы мастакоўска-журналісцкі перфоманс. Нінэль Іванаўна шукала ў шарэнгах састаўленых ля сцен палотнаў партрэты людзей, пра якіх гаварыла... Расказвала гісторыю стварэння той ці іншай работы... Паказвала свае «даўгабуды»-незавяршонкі, распачатыя 5—10 і нават 20 гадоў таму....**

**Яшчэ дзень — і майстэрня стане іншай, дзесяткі карцін зменяць прапіску.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**«Твар душы не схаваеш у вопратку» — менавіта гэты дэвіз вызначыла для сябе Шчасная яшчэ ў пачатку творчага шляху. І невыпадкова.**

**...Яна нарадзілася ў Полацку ў сям'і настаўнікаў. Сям'я была сапраўды класічная: сем «я» — бацькі і пяцёра дзяцей, чатыры дзяўчынкі і хлопчык. Нэла — старэйшая. З пахвальнай граматай скончыла 7 класаў, на выдатна — Мінскае мастацкае вучылішча. Потым — Ленінградскую акадэмію мастацтваў (інстытут імя Рэпіна), факультэт жывапісу.**

*(Заканчэнне на 5-й стар.)*

### АДНЫМ — САМАГОНКА, А ДРУГІМ — РАЗБАЎЛЕНЫ СПІРТ

У Пружанскім раёне падчас аперацыі па барацьбе з незаконным вырабам і рэалізацыяй алкагольнай прадукцыі былі выяўлены стацыянарныя апараты для вырабу гарэлкі. У лесе каля вёсак Броды, Тарасы, Шпакі, Шчэрбы такія апараты былі ліквідаваны. На некаторых жыхароў вёсак Шчэрчава і Арабнікі склалі пратаколы аб адміністрацыйнай адказнасці. У першай вёсцы прадавалі разбаўлены спірт, а ў другой — самагонку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

07100>

9 771990 763008

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, мікрахвалевую печ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 2 ліпеня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 ліпеня 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 верасня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 чэрвеня 2007 года. Удачы ў гульні!**

### 1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгодзе 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ на III кв. або II паўгодз. 2007 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] ______________________
(індэкс)

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

---

ПВ | месца | літар

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету

(індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

Метэазводка

# Спякота б’е рэкорды. Ці надоўга?

**Канец мая ў краіне выдаўся анамальна спякотным. Метэастанцыі ў многіх раёнах зарэгістравалі тэмпературныя рэкорды, адзначыў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра Дзмітрый Рабаў. Гэта датычыцца Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, часткі Брэсцкай абласцей. Сярэднесутачная тэмпература складала на 6—10 градусаў вышэй кліматычнай нормы, што нават больш, чым для самага спякотнага нашага месяца — ліпеня.**

Гэта звязана з тым, што на нашу тэрыторыю з заходняй Еўропы змясціўся антыцыклон, які сфарміраваўся ў вельмі цёплай паветранай масе. Ён і прынёс нам спякоту. Потым ён пачаў змяшчацца на Маскоўскую вобласць, дзе зараз і знаходзіцца. А наша атмасферная прастора ссоўваецца да поля паніжанага ціску з цэнтрам над Заходняй Еўропай, і да нас ідзе вельмі цёплае, але вільготнае паветра, якое стварае тэндэнцыю да ўтварэння кучададжджавой воблачнасці. Гэта і прыносіць да нас пасляабедзенныя лівні і навальніцы. Тэмпература паветра перавышае 30—31 градус.

З пачатку чэрвеня надвор’е ў краіне крыху зменіцца. Да нас завітае антыцыклон, які ўтварыўся ў больш прахалоднай паветранай масе над раёнам Скандынавіі. І ён паціху будзе спускацца ўніз. Тэмпература ў дзённыя гадзіны складзе 20—25 . Гэта блізка да кліматычнай нормы, якая роўная для чэрвеня 15—17 градусаў.

У далейшым па меры перамяшчэння гэтага антыцыклона паветра будзе награвацца і тэмпература яго ў другой пяцідзёнцы чэрвеня зноў павысіцца. Да нас пойдзе цёплае паветра з Міжземнамор’я, зноў утворыцца кучададжджавая воблачнасць. Без дажджоў не абыдзецца, але яны будуць насіць кароткачасовы характар і пройдуць у асноўным у дзённы і вячэрні час.

Паводле папярэдняга прагнозу, у другой палове чэрвеня на змену антыцыклону будуць прыходзіць цыклоны са сваімі атмасфернымі франтамі, таму вельмі спякотнага надвор’я не будзе. Тэмпература паветра складзе 20—25 , а ў паўднёвых раёнах — да 30 цяпла. Чакаюцца дажджы, але непрацяглыя.

## ЧАМУ Ў ВЫХАДНЫЯ ДНІ ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ ПСУЕЦЦА НАДВОР’Е?

Нямецкія метэаролагі на гэты конт правялі даследаванні. Яны вывучылі 6 мільёнаў метэазводак па ўсёй Еўропе, уключаючы нашу рэспубліку, і прыйшлі да высновы, што самая халодная тэмпература паветра і воблачнае надвор’е бывае па суботах. Радзей за ўсё дажджы ідуць у панядзелак. А самым сонечным днём з’яўляецца аўторак. Даследчыкі мяркуюць, што ў гэтым вінаваты сам чалавек. На працягу ўсяго рабочага тыдня людзі актыўна выкарыстоўваюць аўтатранспарт, выхлапныя газы якога быццам утвараюць дробны пыл, які закрывае сонца і паскарае ўтварэнне воблакаў. Таму ў выхадныя дні надвор’е псуецца. Гэта толькі адзін з варыянтаў, што можа паўплываць на атмасферныя працэсы.

**Вольга ШАЎКО.**

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **69** дзён

## Смелая, аб’ектыўная, аператыўная

Больш за 30 гадоў выпісваю і чытаю «Звязду» і ўвесь гэты час не было аніводнай прычыны для расчаравання ў любімым выданні. Хоць у газеты ёсць пэўныя недахопы (мяжы дасканаласці, як вядома, няма), але выдатных якасцяў значна больш. Мне асабліва імпануе беларускі характар газеты. «Звязда» адначасова разважлівая, памяркоўная, смелая, аб’ектыўная і аператыўная. Памятаю, як на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя газета вяла бескампрамісную барацьбу з карупцыянерамі і «прыхватызатарамі» дзяржаўнай маёмасці. Напрыклад, менавіта, дзякуючы карэспандэнцыі ў «Звяздзе» рэспубліканскай Пракуратуры ў 1994 годзе ўдалося спыніць незаконную прыватызацыю памяшкання ў цэнтры Мінска і нават прадухіліць міжнародны скандал, бо ў тым будынку былі і зараз знаходзяцца амбасады дзвюх еўрапейскіх краін. І падобных смелых і, галоўнае дзейсных публікацый на старонках старэйшай беларускай газеты за ўсю яе гісторыю было мноства. Я ўпэўнены, што і надалей журналісты выдання не здадуць сваіх прынцыповых пазіцый.



**Міхаіл СНЯГІР, пракурор Мінскай вобласці, заслужаны юрыст Беларусі.**

**ПАВАЖАНЫЯ МІНЧАНЕ!**
**з 4 па 25 чэрвеня г.г. з 11.00 да 17.00 на Галоўпаштамце (пр. Незалежнасці, 10) праводзяцца Дні падпісчыка.**
Толькі ў гэтыя дні, афоміўшы падпіску на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, Вы зможаце ўзяць удзел у розыгрышы латарэі і атрымаць прыз. У праведзенні Дзён падпісчыка ўдзельнічаюць рэдакцыі газет і часопісаў. Запрашаем Вас аформіць падпіску на другое паўгоддзе 2007 г. Вас чакаюць прыемныя сюрпрызы!
БЕЛПОЧТА
**Адміністрацыя вытворчасці «Мінская пошта».**

# МАЦЯРЫНСТВА І ДЗЯЦІНСТВА АБАРОНЕНЫ ДЗЯРЖАВАЙ



**Мінулы год быў названы Годам маці, сёлетні, як вядома, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь аб’яўлены Годам дзіцяці. У нашай краіне ўжо шмат зроблена для падрастаючага пакалення, і ў гэтым годзе будзе працягвацца актыўная работа па далейшаму паляпшэнню становішча дзяцей, абароне іх правоў. Хто як не дзіцячы ўрач можа ведаць лепш праблемы беларускіх дзяцей і іх маці? Таццяна АРЦЮШЫНА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і член парламенцкай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях, справах ветэранаў і інвалідаў, 27 гадоў свайго жыцця прысвяціла дзіцячай медыцыне. Сёння яна — наша суразмоўніца.**

**— Таццяна Анатольеўна, як часта вы праводзіце прыёмы, з якімі пытаннямі да вас звяртаюцца выбаршчыкі?**

— Прыёмы праводзяцца штомесячна. Па кансультацыйную або іншую дапамогу звяртаюцца кожны месяц у сярэднім каля 30 чалавек. Часцей за ўсё гэта цэлы блок пытанняў па ахове здароўя, звяртаюцца людзі з жыллёва-камунальнымі праблемамі. Цікавяць насельніцтва пытанні прававога характару, асветы. Я падтрымліваю рабочыя сувязі з бабруйскімі паліклінікамі, дзіцячымі бальніцамі, у якіх 27 гадоў працавала ўрачом-педыятрам, бо Ленінскі раён горада Бабруйска з’яўляецца маёй галоўнай выбарчай акругай.

**— Як прадстаўнік медыцыны і дэпутат Палаты прадстаўнікоў што вы можаце расказаць аб праблеме мацярынства і дзяцінства ў нашым грамадстве?**

— Мацярынства і дзяцінства заўсёды былі абаронены нашай дзяржавай. І колькасць нованароджаных з кожным годам, дзякуй Богу, у нас павялічваецца. У Беларусі нізкая дзіцячая смяротнасць (у 2006 годзе яна склала 5,3 на тысячу народжаных супраць 13,3 у 1995-м). Але прагнозы па колькасці насельніцтва, на жаль, па-ранейшаму застаюцца несуцяшальнымі: пры тых узроўнях нараджальнасці і смяротнасці, якія мы зараз маем, як прагназуецца, колькасць насельніцтва рэспублікі да 2010 года знізіцца прыблізна на трэць мільёна чалавек. У цяперашні час галоўнымі праграмнымі дакументамі па падтрымцы і абароне дзяцей і жанчын з’яўляюцца дзяржаўная праграма «Дэмаграфічная бяспека», Прэзідэнцкая праграма «Дзеці Беларусі», нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнню становішча дзяцей і ахове іх правоў на 2004—2010 гады. Распрацаваны і прыняты праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем’ям, якія выхоўваюць дзяцей». Гэтым праектам замацавана права на атрыманне дапамогі ў поўным памеры асобам, якія выхоўваюць дзіця да трох гадоў і якія працуюць ва ўмовах няпоўнага рабочага дня, або якія працягваюць адукацыю на дзённай форме навучання. У цяперашні час дапамога складае 65 працэнтаў пражытковага мінімуму, да ста працэнтаў яе плануецца павялічыць ужо праз два гады. Што датычыцца матэрыяльнай падтрымкі сем`яў, то зараз пры нараджэнні першага і другога дзіцяці выплачваецца прыкладна 340 тысяч рублёў, або два бюджэты пражытковага мінімуму. Да 2008 года пры нараджэнні першага дзіцяці выплаты павялічацца да пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму, а пры нараджэнні другога — да сямі. І яшчэ адна навіна. Матулям, якія своечасова сталі на ўлік у жаночых кансультацыях, каб пазбегнуць ускладненняў цяжарнасці, плануецца выплачваць адзін бюджэт пражыткавага мінімуму.

Таксама варта адзначыць, што ў новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса, прынятага ў першым чытанні, дазваляецца працаваць жанчынам, якія маюць дзяцей да трох гадоў, у начны час з пісьмовай згоды жанчыны, што для многіх з’яўляецца зручным і неабходным.

**— Таццяна Анатольеўна, ёсць асобыя дзеці, якія абдзелены лёсам. Гэта дзеці-інваліды. Што робіцца для іх падтрымкі?**

— Безумоўна, гаворачы аб дзяржаўнай сістэме па абароне мацярынства і дзяцінства, абавязкова трэба сказаць аб такой катэгорыі дзяцей, як дзеці-інваліды, якіх у нашай краіне паўтара працэнта. У прававой, інтэлектуальнай, сацыяльнай абароне гэтых дзетак нашай краінай зроблена вельмі шмат: прыняты Закон «Аб спецыяльнай адукацыі», паспяхова працуюць карэкцыйна-развіваючыя цэнтры (за мінулы год дапамога была аказана 7151 дзіцяці), адбываецца далучэнне дзяцей да навучальна-выхаваўчага працэсу. Аднак яшчэ шмат трэба зрабіць у пытаннях прафілактыкі і папярэджання дзіцячай інваліднасці, правядзення рэабілітацыйных мерапрыемстваў па аднаўленню ў сацыяльных правах.

**— Ужо 21 год прайшоў з моманту чарнобыльскай аварыі. Ці захавалася, на ваш погляд, актуальнасць гэтай праблемы?**

— Безумоўна, актуальнасць гэтага пытання ніхто не аспрэчвае. Праблема па-ранейшаму існуе не толькі ў памяці. Аздараўленне патрэбна як дзецям, так і дарослым.

**— Як вы лічыце, дзе лепш аздараўляцца дзецям: за мяжой або ў Беларусі?**

— Усё ж такі акліматызацыя і адаптацыя звычайна адмоўна адбіваюцца на самаадчуванні людзей, таму лепш адпачываць у Беларусі. Тым больш беларускія аздараўленчыя комплексы, санаторыі добра абсталяваныя, у іх працуе высокакваліфікаваны персанал.

**— Ці можна даведацца, над якімі законапраектамі зараз праводзіцца работа ў Палаце прадстаўнікоў?**

— Рыхтуюцца законы да першага і другога чытанняў. Гэта законапраекты «Аб ахове працы», «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнай абароны дзяцей у няўдалых сем’ях», «Аб занятасці насельніцтва», «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях спагнання аліментаў для дзяцей».

**— Таццяна Анатольеўна, калі не сакрэт, наколькі камфортна працаваць дэпутату?**

— Гэта не сакрэт. У кожнага дэпутата ёсць асабісты кабінет, у якім знаходзіцца неабходны для прадуктыўнай работы мінімум. Гэта камп’ютар, тэлефон і тэлевізар. Што датычыцца машыны, то яна прадастаўляецца кожнай камісіі і можа выкарыстоўвацца выключна ў службовых мэтах. Яшчэ ў мяне ёсць службовая кватэра ў Мінску, якую я аплачваю сама. Можа нехта лічыць, што дэпутаты карыстаюцца асаблівымі льготамі, але гэта зусім не так.

**Наталля НОВІК.**

Імпрэза

# У ЧЭРВЕНЬ — З МІРАМ!

Першыя выхадныя чэрвеня хіба не самымі насычанымі будуць у пасёлку Мір. Гэта і зразумела — там жа «Мірскі замак». Не толькі той, што ўзвышаецца непрыступнымі мурамі. Але яшчэ такую назву атрымаў рэгіянальны фестываль мастацтваў, які даступны і цікавы для людзей самых розных узростаў і прыхільнасцяў. Лічыце:

- будзе камерная музыка з праграмай «Знакамітыя імёны Беларусі». Яе выканаюць камерныя калектывы Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі. Між іншым, будуць іграць музыку былых уладароў замка. А хто не хоча адчуць сябе хоць трошкі панам, для якога іграюць лепшыя музыкі дзяржавы?;

- папулярная музыка будзе для таго, «...Каб песняй напоўніць нябёсы». Гэта ўмеюць рабіць салісты таго ж аркестра, якія спяваюць без «фанеры» на любой пляцоўцы. А калі побач замак, то і ён дапаможа перадаць асаблівы дух Беларусі. Тым больш, што песні будуць услаўляць Янку Купалу і Якуба Коласа. Песняроў, якія ўмеюць кранаць словамі з самой вечнасці;

- народная музыка, здаецца, адтуль жа. Яна зараджае энергіяй і шчырасцю «Напеваў Карэліччыны». Асабліва, калі побач народны кірмаш і горад майстроў, нібыта з даўніх часоў;

- пра тое, што было раней, і як узнікалі іншыя беларускія гарады і знакавыя будынкі, ведаюць нашы навукоўцы. У іх у «Мірскім замку» свая праграма. І часам бывае вельмі шкада, што выступленні навукоўцаў не транслююцца на ўсю тэрыторыю вакол замка;

- затое даступная для наведвальнікаў фотавыстава «Мірскі замак — крыніца натхнення», якую прадстаўляюць сябры фотаклуба «Гродна», якія па-свойму глядзяць на галоўны будынак гістарычнага мястэчка;

- дык і ёсць тут адчуванне сапраўднага старажытнага беларускага горада, дзе ходзяць рыцары пры поўнай амуніцыі. У іх свая мэта — адстаяць гонар у рыцарскім турніры. Хоць зразумела, што тут усе свае і ніхто ні з кім не змагаецца;



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

- нават процілегласці сустракаюцца ў адной праграме, дзе наша будзе супраць іхняга. «Наша» ўвасобіць Народны хор імя Цітовіча пад кіраўніцтвам прафесара Дрынеўскага. «Іхняе», зразумела, — джаз ад аркестра пад кіраўніцтвам прафесара Фінберга. Значыць, што яно ўжо таксама наша. Тым больш што ў Міры джаз будзе гучаць не ўпершыню.

Фестываль пяты і арганізатары навучыліся рабіць яго зручным для публікі. Тым больш што на яго збіраюцца не толькі мясцовыя жыхары, а прыязджаюць людзі спецыяльна нават са сталіцы. Таму што каб атрымаць яшчэ дзе-небудзь столькі задавальнення адразу — трэба вельмі пастарацца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «Белая Русь» — у Магілёўскім раёне

**31 мая ў пасёлку Буйнічы Магілёўскага раёна адбыўся ўстаноўчы сход раённага грамадскага аб’яднання «Белая Русь».**

Як вядома, гэта аб’яднанне з’явілася ў Гродзенскай вобласці ў 2004 годзе і мае на мэце падтрымку курса, які праводзіць кіраўніцтва дзяржавы. Сёння членамі «Белай Русі» з’яўляецца больш за 12 тысяч чалавек і працуе 800 пярвічак. Ініцыятыву гродзенцаў вырашылі падтрымаць у Магілёўскім сельскім раёне. Некалькі дзесяткаў чалавек сабраліся ў зале Буйніцкай дзіцячай школы мастацтваў: у іх ліку жыхары ўсіх сельсаветаў раёна, прадстаўнікі інтэлігенцыі і сялянства, маладыя людзі, ветэраны вайны і працы ды іншыя.

— Я прачытаў у газеце заклік гродзенскай «Белай Русі» і зацікавіўся, — расказаў дырэктар школы мастацтваў Пётр Алтынаў, якога ўстаноўчы сход абраў старшынёй раённай арганізацыі «Белай Русі». — Мне спадабалася праграма і мэты грамадскага аб’яднання. І мы вырашылі стварыць такое і ў нас. Я мяркую, што падобныя арганізацыі будуць створаныя па ўсёй краіне, таму што «Белая Русь» ставіць перад сабой высакародныя мэты: аб’яднанне прагрэсіўных сіл краіны і аказанне дапамогі моладзі, ветэранам, працоўным калектывам і гэтак далей. Вельмі важнае — наша падтрымка кіраўніка краіны.

Выкладчыца Буйніцкага агралесатэхнічнага каледжа і дэпутат абласнога Савета Святлана Арлоўская лічыць, што людзі нездарма падтрымліваюць сённяшні курс дзяржавы: яны бачаць, адчуваюць вынікі — эканамічны рост, стабільная палітычная сітуацыя, моцная сацыяльная абарона насельніцтва. На думку дэпутата, і на прыкладзе Буйнічаў можна прасачыць выкананне праграмы адраджэння вёскі: тут шмат пабудавана і прыводзіцца ў парадак.

— Арганізацыя Магілёўскага раёна — гэта, так бы мовіць, «першая ластаўка» ў нашай вобласці, — сказала на сходзе Святлана Арлоўская. — Мы спадзяёмся, што нас многія падтрымаюць і далучацца да нас, таму што, я лічу, мы робім добрую справу.

Ва ўстаноўчым сходзе бралі ўдзел прадстаўнікі розных пакаленняў.

— У нас шмат грамадскіх арганізацый, але я мяркую, што калі мы будзем у адным аб’яднанні, то нам будзе лягчэй разам пайсці ў будучыню, — сказала другі сакратар раённай арганізацыі БРСМ і дэпутат раённага Савета Алеся Купцова.

— Я хачу, каб гэта арганізацыя была створана, — паведаміў ветэран вайны з вёскі Сідаравічы Іван Гуркоў. — Ветэраны ідэю падтрымліваюць і будуць разам з іншымі працаваць і знаёміць насельніцтва з праграмай і мэтамі «Белай Русі».

Устаноўчы сход у Магілёўскім раёне выступіў з прапановай аб стварэнні Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб’яднання «Белай Русі».

**Ул. інф.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВАСІЛЕВІЦКІ ХЛЕБ

Яго хваляць ва ўсім Рэчыцкім раёне і нават за межамі. «Каралінскі», «Жыткавіцкі», «Васілевіцкі», «Васілевіцкі палепшаны» з карыцай і разынкамі... Любому вырабу хлебазавода палескага горада рады спажыўцы — ён сапраўды смачны. Апошняя ўласная распрацоўка васілевіцкіх хлебапёкаў — заварны хлеб па 4-стадыйнай тэхналогіі.

— Мы штодня імкнёмся вытрымліваць якасць нашых вырабаў, — кажа зменны тэхнолаг прадпрыемства Наталля Абдукерына (на фотаздымку), — цяпер вельмі вялікая канкурэнцыя.

Дзесяць гадоў таму Наталля Абдукерына закончыла Баранавіцкі тэхналагічны тэхнікум і прыйшла працаваць на Васілевіцкі хлебазавод. Сёння магутнасці прадпрыемства дазваляюць выраб 6—7 тон прадукцыі за год.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

# ПЕРШЫ І ГАЛОЎНЫ

**Ён можа ўтрымліваць марскую капусту, тапінамбур, назынкі, курагу, грэцкі арэх, чарнасліў, селен, ёд, фоліевую кіслату, жалеза, бэтакарацін, мёд, патаку, нават сала. У распрацоўцы яго складальнікаў удзельнічаюць вядучыя навуковыя лабараторыі краіны, напрыклад, такія, як «Унітэхпрам» БДУ. Штогод ствараюцца новыя віды гэтага прадукту, міжнародныя конкурсы і кірмашы, на якіх аўтарытэтнае журы прысуджае залатыя ўзнагароды і дыпломы за яго высокую якасць і карысныя ўласцівасці, нязменна збіраюць вялізарную колькасць удзельнікаў. Для яго вытворчасці сёння выкарыстоўваецца найноўшае абсталяванне, а між тым першая спроба стварэння гэтага прадукту зафіксавана, прыблізна, у каменным веку.**

Час ідзе, свет мяняецца, але гэты прадукт заўсёды заставаўся сярод самых любімых страў чалавека, без якіх немагчыма было ўявіць ніводную эпоху. Хлеб, а менавіта пра яго ідзе размова, для людзей быў больш чым проста ежай. Перыяд сучаснага гастранамічнага насычэння выдумаў мноства харчовых замяняльнікаў, у некаторых краінах спажыўцы ўжо не ў стане зразумець, дзе натуральны прадукт, а дзе яго генетычна мадыфікаваны аналаг. Цікава, што ўсе апошнія кулінарныя тэндэнцыі закранулі ў тым ліку і смакавыя якасці, знешні выгляд хлеба. Аднак не змаглі яны адмяніць той факт, што на працягу існавання чалавецтва хлеб з’яўляецца галоўнай стравай на стале. І нават у апошнія гады, калі ва ўсім свеце людзі сталі ўжываць менш хлеба, ён не здае свае пазіцыі. Беларуская, калі можна так сказаць, школа хлебапячэння традыцыйна была адной з лепшых. Мода застаецца модай, а хлеб, нягледзячы на змяненні — застаецца тым, чым ён быў тысячагоддзі таму.

— Замест чорнага хлеба больш сталі есці белы, акрамя таго, спажывец прад’яўляе да яго больш патрабаванняў. Таму вытворцы хлеба павінны ісці ў нагу з часам, — кажа Міхаіл Шыцько, галоўны інжынер аднаго з самых вялікіх у краіне аб’яднанняў па вытворчасці хлебных вырабаў РУП «Барысаўхлебпрам». — Стала модным здаровае харчаванне, і мы вырабляем зараз хлеб дыетычных гатункаў, кожны паважаючы сабе завод павінен мець у сваім асартыменце як мінімум некалькі відаў такога хлеба. Засвоілі мы і лінію па выпуску дыябетычных вырабаў.

Толькі ў Мінскай вобласці штогод выпускаецца больш за 340 відаў хлебабулачных вырабаў і 300 — кандытарскіх. У Нясвіжы — «Стараградскі» і «Міхайлаўскі», «Апетытны» і «Замкавы», у Маладзечне — «Губернскі» і «Хожаўскі», у Жодзіне — пончыкі, смак якіх запоўніўся з дзяцінства, у Вілейцы — ёгуртавыя тарты з бісквітнай начынкай, піроржныя з садавіной і карамеллю, у Салігорску — вітамінізаваныя «Брыз», «Агеньчык» і «Вітамінка». Назвы і гатункі можна пералічваць бясконца. Толькі непасвячонаму падаецца, што выпякаць хлеб проста. Між тым спосабаў і рэцэптур існуе такая разнастайная колькасць, што можна заблытацца. Сучасныя хлебапёкі нават ствараюць хлеб без ужывання дрожджаў.

...«*З вечара ў дзяжу насыпаюць трэць ці палову мукі, прызначанай для выпечкі, і запраўляюць цёплай вадой тэмпературай каля 25 градусаў па Рэамюру альбо сыроваткай ці кіслым малаком?...* — гэта вытрымкі з кнігі «Літоўская гаспадыня», выдання кшталту сучаснай «Энцыклапедыі маладой гаспадыні». За гэты час змянілася амаль усё, але, што самае цікавае, падыходы да рэцэптуры амаль паўтараюцца:

— Кожны з хлебазаводаў імкнецца вырабіць нешта новае, тое, што задаволіла б людзей. Вялікім попытам карыстаецца заварны хлеб. Розныя яго віды адны з самых любімых у пакупнікоў. Вось мы, напрыклад, адзінае не толькі ў краіне, але і ў СНД прадпрыемства, якое запатэнтавала тэхналогію і валодае сакрэтамі стварэння хлеба на хмелявой заквасцы, — паведаміла галоўны тэхнолаг, начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі РУП «Барысаўхлебпрам» Ала Дзяменцьева. — У апошні час пачалі распрацоўваць рэцэптуру хлеба, які зроблены на аснове кефірнай закваскі, на гэта таксама мяркуем атрымаць патэнт. Такім чынам, кожны з хлебазаводаў імкнецца вырабіць прадукцыю, якая б адрознівала яго ад іншых.

...А вось некалькі этапаў сучаснага спосабу прыгатавання булак і жытня-пшанічнага хлеба. Спачатку мука змешваецца з заквaскай і іншымі інгрэдыентамі. Потым гатовае цеста праходзіць праз этап дзялення. На гэтай стадыі важна, каб яно не падвяргалася дэфармацыі і захоўвалася яго структура, таму лепш за ўсё, калі цеста «ўсмоктваецца» спецыяльным апаратам, а потым дзеліцца нажом. Пасля «дзельніка» будучы хлеб ідзе на акругленне, затым трапляе ў спецыяльную шафу папярэдняй расстойкі, дзе яно «адлежваецца» прыблізна пяць—восем хвілін. Потым — на раскатачную машыну, якая робіць сваю справу ў залежнасці ад таго, што трэба атрымаць — лаваш, багет, рагалік... А ўжо пасля раздзелкі і ўкладкі на лісце «загатоўкі» (так называюць будучыя булкі) трапляюць у камеру канчатковай расстойкі, дзе створана пэўная тэмпература і рэжым вільгаці. Будучы хлеб рыхтуецца да таго, каб пайсці потым у печ. А з яе — на наш стол. Перад гэтым, канешне ж, мы набываем яго ў магазінах. Дарэчы, найбольш удала хлеб распрадаецца ў фірмовых крамах, якія адчыняюцца пры заводах-вытворцах: адразу ж, з печы, гарачы і спелы...

— Канкурэнцыя на рынку хлебапёкаў вельмі жорсткая, таму трэба адсочваць тэндэнцыі і вывучаць густы спажыўцоў пастаянна. Для гэтага праводзяцца дэгустацыі сярод наведвальнікаў магазінаў, — узгадвае Міхаіл Шыцько. — Праблема захавання аб’ёмаў вытворчасці, высокай якасці і папулярнасці хлеба сярод пакупнікоў вырашаецца за кошт таго, што мы пастаянна вырабляем новы асартымент. І не толькі, трэба ісці далей: будзем яшчэ мяняць і ўпакоўку. Мы ўпакоўваем прыблізна трэцюю частку нашага хлеба, дзесяць працэнтаў — упакоўваем і разразаем. Аднак у будучым замест тэрмаўкладачнай плёнкі і поліэтылену будзем упакоўваць вырабы ў папяровыя пакеты, ужо плануем для гэтых мэтаў набыць абсталяванне.

Адносіны да хлеба, ці той стравы, што мела іншую назву, але была вельмі падобнай, ва ўсіх народаў адлюстроўвалі тую ступень, на якой знаходзіцца культурнае развіццё нацыі. Нават у сучаснасці, калі абсталяванне замежнай вытворчасці дазваляе выпякаць любы кулінарны выраб, рэцэптуру некаторыя вытворцы захоўваюць старажытную. Мабыць, таму, што так хлеб смачнейшым атрымліваецца. Напрыклад, на Нясвіжскім хлебазаводзе ўжываюць рэцэпт латвійскіх калег. Хлеб вырабляецца па старажытнаму прыбалтыйскаму працэсу, па так званай «доўгай» тэхналогіі, калі яго стварэнне цягнецца каля двух сутак. Затое потым пакупнікам прапануюцца вельмі смачныя вырабы.

...«*Для пытляванага хлеба тэмпература печы павінна складаць каля 60 градасаў па Рэамюру. Для жытняга грубага памолу яе награваюць значна больш. Верх і чарэнь напальваюць аднолькава. Як яны будуць занадта гарачымі, адчыняюць прадушыны і гасяць іх мокрым венікам. Каб упэўніцца, ці спёкся хлеб, стукаюць сярэднімі суставамі пальцаў у ніжнюю скарынку. Гатовы гучыць. Выняты з печы хлеб зноў абліваюць халоднай вадой і на хвіліну засоўваюць назад. Звычайна адзін фунт мукі дае два фунты цеста, а адзін фунт цеста — тры чвэрці добра выпечанага хлеба. З сарака фунтаў мукі павінна атрымацца прыблізна шэсцьдзесят фунтаў хлеба»,* — гэта таксама рэкамендацыі па выпечцы хлеба са старажытнай кнігі.

— Сёлета мы запусцілі тэхналагічную лінію па вытворчасці дробных хлеба-булачных вырабаў. На набыццё найноўшага абсталявання выдаткавалі 500 мільёнаў рублёў. Замес ажыццяўляецца італьянскай машынай, якая дазваляе вырабляць на 25 працэнтаў больш прадукцыі. Нават колькасць харчовых кампанентаў разлічваецца аўтаматычна. Знешні выгляд, структура хлеба значна палепшыліся, — дзеліцца далей Міхаіл Шыцько. — Замежнае абсталяванне, гэта, канешне, «не пальцамі стукаць, каб гучаў». Увогуле, у апошнія гады толькі ў цэху па вырабу булак і фармавога хлеба былі запушчаны дзве новыя тэхналагічныя лініі, якія працуюць на чэшскіх машынах. Усім працэсам кіруе камп’ютар. Сёння сучаснае абсталяванне маецца не толькі на барысаўскім заводзе, але і ва ўсіх філіялах «Барысаўхлебпрама». Дапамагае сродкамі і Мінскі аблвыканкам. У планах — пачаць вялікія пастаўкі хлеба ў сталіцу.

У асяроддзі хлебапёкаў ёсць свае прафесійныя конкурсы і ўзнагароды. Амаль ва ўсіх вялікіх міжнародных фестывалях беларускі хлеб, у тым ліку і вырабы «Барысаўхлебпрама» атрымлівалі пераможныя месцы. Нашы хлеб і булкі, тарты і піроржныя перамагалі на выставах «Аграрусь», Усерасійскім аглядзе якасці, вырабы бралі ўзнагароды ў Маскве, Кіеве, Санкт-Пецярбургу. Застаецца толькі, каб лепшыя віды хлябоў траплялі да стала кожнага беларускага пакупніка. Напрыклад, мінчане вельмі б жадалі, каб у сталічных крамах прадавалася больш барысаўскіх вырабаў — па смаку яны адны з лепшых у краіне.

— Хлеб — гэта народны прадукт. Таму стратэгія работы заводаў-вытворцаў складаецца з таго, каб выпякаць смачныя і любімыя з дзяцінства віды, прапаноўваць новыя гатункі, і пры гэтым кошт хлебабулачных вырабаў не павінен павялічвацца, а ў некаторых выпадках наадварот, ён становіцца ніжэйшым, — падкрэсліў Міхалаі Шыцько.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
СВАЯ СПРАВА — БІЗНЕС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
НАСУСТРАЧ ЧАРНОБЫЛЮ
ЖЫРАНДОЛЯ — Наш культурны асяродак
Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8200 рублёў на месяц<br>24600 рублёў на квартал<br>49200 рублёў на паўгодзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 7850 рублёў на месяц<br>23550 рублёў на квартал<br>47100 рублёў на паўгодзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13000 рублёў на месяц<br>39000 рублёў на квартал<br>78000 рублёў на паўгодзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 11850 рублёў на месяц<br>35550 рублёў на квартал<br>71100 рублёў на паўгодзе |

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

1
ЧЭРВЕНЯ
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 23 (15474)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

# «ТЭСТ — САМЫ НЕПРАДУЗЯТЫ ЭКЗАМЕНАТАР»



**Усяго 12 дзён аддзяляюць беларускіх абітурыентаў ад важнага «старту», да якога яны мэтанакіравана рыхтаваліся некалькі апошніх гадоў. Калі абапірацца на дадзеныя праведзенага Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў прафпрагнозу, то, выходзіць, што сёлета сцены ВНУ збіраюцца штурмаваць 80 працэнтаў выпускнікоў агульных сярэдніх навучальных устаноў. Да іх далучацца таксама выпускнікі папярэдніх гадоў, выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, а таксама першакурснікі ВНУ, якія будуць спрабаваць перапаступіць на бюджэтную форму навучання. Адным словам, лета абяцае быць «гарачым»...**

**Здаецца, пасля таго, як быў адменены сумесны выпускны-ўступны іспыт па дзяржаўнай мове, страсці вакол цэнтралізаванага тэсціравання пакрысе ўлягліся, бо адзнака, атрыманая на цэнтралізаваным тэсціраванні, цяпер не можа сапсаваць выпускніку школьны атэстат. А ў тым выпадку, калі выдатнік не зможа «бліснуць» ведамі на ЦТ, заўсёды знойдзецца прычына-апраўданне. Напрыклад, можна спаслацца на тое, што ў тэсце былі пытанні, якія не ўваходзяць у школьную праграму, што з некаторымі заданнямі не могуць справіцца не толькі школьныя настаўнікі, але і выкладчыкі ВНУ, што для якаснага выканання ўсіх заданняў многім удзельнікам тэсціравання элементарна не хапае часу і гэтак далей.**

— Вы зараз пералічылі ўсе асноўныя абвінавачанні, якія гучаць кожны год пасля абвяшчэння вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, — паведаміў у гутарцы з журналістам «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў.** — Не сакрэт, што школьныя адзнакі далёка не заўсёды пацвярджаюцца на цэнтралізаваным тэсціраванні, і гэта з'яўляецца ці не галоўным раздражняльным фактарам для яго ўдзельнікаў. Па-першае, хачу заўважыць, што дзесяцібальная сістэма, якая прымяняецца ў школе, не можа быць такой жа аб'ектыўнай, як стобальная. У гэтым годзе ўжо 43 ВНУ будуць ажыццяўляць залічэнне на падставе трох сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання, а гэта значыць, па 100-бальнай шкале. Скажу таксама, што «дзевятка» па матэматыцы ў гімназіі ці ліцэі, і «дзевятка» ў сярэдняй школе — гэта розныя рэчы. Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання за апошнія гады дэманструе ўстойлівую залежнасць асабістых вынікаў удзельнікаў ЦТ ад тыпу навучальнай установы, якую скончыў абітурыент. І, як правіла, першыя радкі ў рэйтынгу займаюць выпускнікі гімназій і ліцэяў. А выпускнікі іншых навучальных устаноў ім прайграюць і атрымліваюць больш нізкія вынікі нават пасля інтэнсіўных заняткаў з рэпетытарамі. Па-трэцяе, мэта цэнтралізаванага тэсціравання — правесці конкурсны адбор, размеркаваць прэтэндэнтаў па ўзроўню іх падрыхтоўкі і суаднесці іх паміж сабой. Тэст, магчыма, і не ўніверсальная, але найбольш аб'ектыўная і непрадузятая форма кантролю, якая дазваляе ацаніць рэальны ўзровень ведаў прэтэндэнтаў на студэнцкія месцы і пабудаваць іх рэйтынг паспяховасці. Я асабіста перакананы, што ў абітурыента значна больш шанцаў праявіць сябе падчас выканання тэста, чым падчас здачы ўступнага экзамену ў традыцыйнай форме. Усё ж такі ў тэст па той жа матэматыцы ўключаны 25 заданняў рознай складанасці (ад элементарных заданняў да пятага ўзроўню складанасці), якія дазваляюць адабраць таленавітую моладзь для матэматычных факультэтаў універсітэтаў. У тым выпадку, калі абітурыент «не асіліў» адно заданне, у яго заўсёды ёсць шанц «рэабілітавацца» на іншым.

***— Але ж не ўсе абітурыенты збіраюцца паступаць на факультэт прыкладной матэматыкі ці фізмат, таксама як не ўсе паступаюць на філалагічны факультэт, між іншым, тэсты — аднолькавыя для ўсіх...***

— Час ад часу гучаць прапановы распрацаваць тэсты асобна для будучых інжынераў і асобна — для гуманітарыяў, таму што і першым, і другім цяжка набраць на ЦТ максімальныя балы. Але гэта і не трэба. Фізікі знаходзяцца ў аднолькавых умовах з фізікамі, а лірыкі — з лірыкамі. Складанасць тэставых заданняў ніяк не ўплывае на канчатковае месца таго ці іншага абітурыента ў агульным рэйтынгу. Нас часта папракаюць у тым, што з дзесяткаў тысяч удзельнікаў тэсціравання максімальныя 100 балаў набіраюць толькі адзінкі. Выснова — тэсты празмерна складаныя і іх трэба спрашчаць. Катэгарычна не магу з гэтым пагадзіцца. З улікам міжнароднага вопыту тэсціравання, вынікі пераважнай колькасці ўдзельнікаў тэсціравання павінны быць у дыяпазоне ад 40 да 60 тэставых балаў. Толькі ў гэтым выпадку тэставы бал дазваляе ранжыраваць абітурыентаў з улікам рознага роду падрыхтоўкі. Сёння ж колькасць у Беларусі выпускнікоў навучальных устаноў новага тыпу (гімназій, ліцэяў) і класаў з павышаным і паглыбленым вывучэннем прадметаў ужо фактычна перавышае бюджэтныя магчымасці ВНУ. І як, цікава, мы будзем іх ранжыраваць пасля спрашчэння тэстаў? Тым не менш амаль заўсёды знаходзяцца абітурыенты, якія атрымліваюць на тэсціраванні 100 балаў. Прычым у нас былі ўжо два выпадкі, калі адзін абітурыент двойчы набіраў 100 балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні.

Рызыкну выказаць меркаванне, што нават пры ўмове спрашчэння тэстаў усё роўна 2/3 абітурыентаў, якія не змогуць стаць студэнтамі, звяжуць свае няўдачы з цэнтралізаваным тэсціраваннем і будуць крытыкаваць змест тэстаў. Увогуле не столькі форма іспытаў вызначае даступнасць вышэйшай адукацыі, колькі суадносіны жадаючых і магчымасці навучальных устаноў забяспечыць іх бюджэтнымі месцамі. Значыць, пакрыўджаныя абавязкова будуць...

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

З нагоды

# КАЛІ БАЦЬКІ ЛЮБЯЦЬ ДЗЯЦЕЙ, ТО АБАРОНЯЦЬ

**Памятаю, калісьці даўно ў нас была забава — бегаць навыперадкі па высокай агароджы дзіцячага садка, дзе ўсёй шырыні — сантыметраў з пяць. І нічога, страшна не было. За сэрца хапаліся нашы бацькі, калі гэта бачылі.**

**Мы тады ўвогуле мала чаго баяліся — хіба што Бабая і цемры ў пакоі. А так — вярталіся зацемна, каштавалі на зуб усякую дрэнь, цягалі на руках беспародных бобікаў і мурак, купаліся, дзе нельга, размаўлялі з незнаёмымі і г.д.**

Натуральна, гэта карцінка з уладкаванага — відаць, шчаслівага дзяцінства. Дый час цяпер зусім іншы. Мы выраслі, і выразна ўсведамляем, колькі пагроз і небяспек на шляху крохкіх «кветак жыцця». Мы рэгулярна збіраемся з гэткімі ж дарослымі сур'ёзнымі людзьмі, каб абмеркаваць і вырашыць, як усім разам абараніць нашых дзяцей — ад галечы, голаду, войнаў, хвароб, ад крыміналу і тэлежахаў, ад жорсткага абыходжання і няякаснага харчавання, ад усяго, што стварыў дарослы свет. Урэшце, ад... нас?

Але разважаць на гэту тэму можна бясконца, і ўсё гэта будзе выказванне адной пазіцыі — тых, хто выйшаў з пяшчотнага ўзросту. Мы ж вырашылі даць слова «падабаронным» — ад чаго, на іх думку, трэба трымаць абарону? Сваімі меркаваннямі дзеляцца нашы дзеці — дзеці супрацоўнікаў «Звязды».



Наша «рэкламшчыца» **Алена ДАЎЖАНОК** — вельмі пазітыўны чалавек і сапраўдны дыпламат, мяккі, але настойлівы. А вось яе сын, 9-гадовы **Данік ДАЎЖАНОК**, у апытанні быў канкрэтным і стрыманым, як сапраўдны будучы абаронца:

— Абараняць дзяцей трэба ад боек, ад злых сабак, ад агню, ад курэння і ад наркотыкаў, ад вострых прадметаў, ад дрэнных людзей і асабліва ад зладзееў.

Журналіст **Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА** — адна з тых, хто «дзіцячую» тэму вядзе не толькі на старонках газеты, але і ўвогуле па жыцці. (Дарэчы, менавіта дзякуючы Вользе распачалася акцыя «Звязды» па ўладкаванню дзяцей-сірот у гасцявыя сем'і). Не пажадалі застацца ўбаку і ўсе яе дзеці — Цімох, Мікіта і Даша.



**Дар'я КІШКІНА, 10 гадоў:**

— Бацькі павінны абараняць сваіх дзяцей ад бандытаў, забойцаў і маньякаў. Ад дзіцячых страхаў. Ад хвароб і мікробаў. Ад смутку, журбы, нуды і крыўды.

**Мікіта КІШКІН, 12 гадоў:**



— Дзяцей трэба абараняць ад несправядлівых адносінаў. Ад настаўнікаў, якія неаб'ектыўна ставяць адзнакі, крычаць, абражаюць. Ад бацькоў, якія сваіх дзяцей не любяць: б'юць, не клапоцяцца, не цікавяцца іх жыццём. Ад іншых дзяцей і дарослых, якія робяць зло. Дзяцей трэба абараняць ад жорсткасці, грубасці і бруду, адкуль бы яны ні зыходзілі — ад людзей, фільмаў або кніг.

— А ад хвароб, стыхій, войнаў, катастроф?

— Калі бацькі любяць дзяцей, то яны абароняць ад хвароб — папярэдзяць або вылечаць. Абароняць і ад стыхій, і ад катастроф.



**Цімох КІШКІН, 17 гадоў:**

— Я лічу, па-першае, што дзецям часам патрэбна абарона ад некаторых школьных настаўнікаў. Настаўнік мае вялікую ўладу над вучнем, і ён можа нанесці значную шкоду дзіцяці — яго атэстату, здароўю, псіхіцы. Па-другое, па-мойму, вельмі важна таксама абараняць дзяцей ад іх саміх, ад шкодных звычак, адмоўных якасцяў характару, якія могуць праявіцца ў кожнага дзіцяці. Трэба своечасова выкараняць гэтыя якасці, бо яны ўяўляюць вялікую небяспеку для далейшага нармальнага жыцця дзіцяці.

**Мікола ДЗЯБЁЛА** — відаць, самы падкаваны «крыміналіст» у рэдакцыі, бо піша на праваахоўную тэматыку і наконт тых ці іншых законаў і правілаў часта кансультуе астатніх калег. Вось і ў яго дачкі **Марты** таксама абвостранае пачуццё справядлівасці:



— Дарослыя, як вядома, вельмі любяць палохаць свавольных дзяцей празнымі пачварамі. Аднак на мяне пагрозы кшталту: «Калі не супакоішся, прыйдзе Баба Яга ці Кашчэй Бессмяротны і забярэ цябе», — у маленстве не мелі ніякага ўздзеяння. Я іх зусім не баялася, наадварот, гэтыя казачныя героі здаваліся мне нават нечым сімпатычным. Сапраўдны жах я адчула, паглядзеўшы па тэлевізары казку «Снежная Каралева». Ад халоднага позірку гэтай прыгажуні ў мяне беглі па скуры мурашы. Зараз мне ўжо 11 гадоў, і, натуральна, у існаванне Снежнай Каралевы я не веру. Але пачуццё жаху вяртаецца з маленства, калі на вуліцы, у школе, у краме ці іншых месцах сутыкаюся з халоднай абыякавасцю і грубасцю старшакласнікаў альбо дарослых дзядзькаў і цётак. Не так даўно я стала сведкай такога здарэння. Старэйшыя хлопчыкі збілі вучня малодшых класаў, адабралі ў яго «кішэнныя грошы». Адбывалася ўсё на вачах у дарослых. Я іх прасіла заступіцца за небараку. І хоць бы хто з прахожых спыніўся! Ніхто! Усе прайшлі міма ходзь з абыякавай ухмылкай, а некаторыя нават пасмяяліся з «дзіцячых разборак»... Менавіта ад такіх абыякавых дарослых найперш і трэба абараняць дзяцей. Тады, на маю думку, і маленькія хуліганы не будуць паводзіць сябе нахабна.

Вядучы тэхнічны рэдактар **Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ** заўжды выглядае, як маладзенькая дзяўчынка — танюткая, сціплая, вельмі адказная. Тым не менш, ёй ужо ёсць чыё дзяцінства абараняць — сына. А ён сам падкажа, ад чаго.



**Антон СПЯСІВЫХ, 7 гадоў:**

— Дзяцей трэба абараняць ад: вайны, Смерці, зладзееў, пажару, хваробы, ворагаў, дрэнных людзей. («А чаму «Смерць» ты напісаў з вялікай літары? — пацікавілася мама Антона. — Мне так падалося. Бо яна страшная», — сур'ёзна адказаў хлопчык. — **Аўт.**).

Як кажуць, вуснамі дзіцяці... Робім высновы, спадары дарослыя?

**Падрыхтавала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**P. S.** *Вялікі дзякуй усім бацькам і дзецям за ўдзел у апытанні.*

## ГРАН-ПРЫ І БОЧКА МЁДУ

У Клімавічах прайшоў фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». Сёлета яго праводзілі 12-ы раз, а сем гадоў таму фестываль стаў міжнародным. Цяпер у Клімавічах гасцявалі амаль 900 дзяцей з 9 краін — акрамя постсавецкіх, яшчэ з Кітая і Турцыі. Гран-пры «Залатой пчолкі-2007» у танцах атрымала група з кітайскага горада Шантоў. Яе ўдзельнікі — 9—11-гадовыя танцоры — заваявалі сімпатыі журы і публікі танцам з драконамі. Мінская кампанія «Свет здароўя і мёду», якая выступіла спонсарам клімавіцкага фестывалю, уручыла кітайскаму калектыву 100-кілаграмовую бочку мёду. Перамаглі ў розных фестывальных намінацыях юныя таленты з Беларусі: саліст вакальнай студыі з Мазыра Міхаіл Ліла, трубач з Глуска Арцём Канстанцінаў, рэзчык па дрэву з Лепеля Віцебскай вобласці Дзіма Будзіч, мастачка з Клімавічаў Даша Голікава, цыркавы калектыў «Юнацтва» з Наваполацка і студыя моды «Авангард» з Магілёва.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ДЗЕ ВУЧЫЦЦА?

Сёлета студэнтамі стануць 75,3 тысячы чалавек, з іх 42,5 тысячы будуць вучыцца на дзённым аддзяленні. Бюджэтных месцаў для абітурыентаў-2007 выдзелена больш за 30 тысяч. У вышэйшыя навучальныя ўстановы, падначаленыя Міністэрству адукацыі, на бюджэтнае аддзяленне плануецца прыняць 22 тысячы чалавек, у ВНУ, падначаленыя Міністэрству аховы здароўя, — 2 тысячы, Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання — 3,2 тысячы чалавек. Студэнтамі падшэфных ВНУ Міністэрства культуры стануць 985 чалавек, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — 265, Міністэрства гандлю — 609 і Міністэрства абароны — 780 чалавек.

**Яўгенія ПАШКЕВІЧ,**
*«Мінск-Навіны».*

# ГАЛОЎНАЕ ПРЫ ПОШУКАХ АДКАЗУ — ЦЯРПЕННЕ, РАЗВАГА І НАСТОЙЛІВАСЦЬ

**Тэсты як форма кантролю ведаў і ўменняў навучэнцаў у апошнія гады атрымалі шырокае распаўсюджанне. Сённяшнія тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання прадугледжваюць правядзенне іх па адзіных стандартах і адначасова па ўсёй краіне, што дазваляе гаварыць аб масавасці і (самае галоўнае) аб'ектыўнасці вымярэння адукацыйных дасягненняў выпускнікоў школ.**

Сённяшні вобраз выпускніка школы, які рыхтуецца да паступлення ў ВНУ, набыў даволі спецыфічныя выраз. Гэта заклапочаная маладая асоба, якая амаль з 1 верасня стала на старт шматмесячнага марафону і ўключыла ў гэты працяглы прабег бацькоў, сяброў і настаўнікаў. Ліхарадачна скупляюцца кнігі, вядуцца пошукі рэпетытараў, і самі віноўнікі вымушаны закінуць дыскатэкі і кінатэатры, днямі і начамі сядзець за даведнікамі і дапаможнікамі. Як знізіць фізічную і псіхалагічную нагрузку выпускнікоў і настаўнікаў, раўнамерна размеркаваць сілы на ўвесь падрыхтоўчы перыяд, якой літаратурай лепш карыстацца, якія найбольш тыповыя памылкі папярэднікаў? На гэтыя і іншыя пытанні мы паспрабуем адказаць на старонках газеты.

Будзе карыснай інфармацыя аб тым, што ў мінулым годзе ў тэсціраванні па беларускай і рускай мовах прынялі ўдзел звыш 170 тысяч чалавек (75 195 па беларускай мове і 96 032 па рускай). Уявіце сабе гэты вялізны горад, кожны жыхар якога пасля іспытаў застыў у чаканні вынікаў з надзеяй на добрыя адзнакі. На жаль, большасць удзельнікаў тэсціравання была расчаравана: сярэдні бал выкананай работы па рускай мове — 34,7, па беларускай мове — 36,49.Сума балаў ад сямідзесяці і вышэй — толькі ў сямі працэнтаў тэсціруемых. Атрымаць максімальную адзнаку ў сто балаў па рускай мове ўдалося толькі чатыром абітурыентам, а па беларускай мове гэтага не дасягнуў ніхто.

Такія вынікі тэсціравання прымушаюць задумацца над пытаннямі адарванасці школьнай праграмы ад матэрыялаў ЦТ, высокай складанасці многіх заданняў і інш. Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў сцвярджае, што заданні адпавядаюць норме, калі 100 балаў атрымлівае не больш за пяць працэнтаў тэсціруемых. Мы не збіраемся дыскутаваць з паважаным Мікалаем Сцяпанавічам і толькі адзначым, што ўсе тэсты метадычна і навукова абгрунтаваныя, яны прайшлі экспертызу Міністэрства адукацыі і складзены на аснове праграм уступных іспытаў. Там ёсць заданні і базавага, і павышанага ўзроўню (але не паглыбленага). Паводле меркавання спецыялістаў, нельга зрабіць зрэз абітурыентаў толькі на базавым узроўні і выбраць такім чынам студэнтаў для вышэйшай школы. Прапанаваныя тэсты, такім чынам, паставілі ўсіх абітурыентаў у аднолькавыя ўмовы. Тут, безумоўна, можна выказаць спачуванне фізікам і матэматыкам, якія разам з лірыкамі-філолагамі выконвалі тыя ж рознаўзроўневыя заданні па ўсіх раздзелах курса.

Школьнікі і іх бацькі часта задаюць пытанне: якой літаратурай лепш за ўсё карыстацца пры падрыхтоўцы да тэсціравання. Бясспрэчна, лепш выкарыстоўваць школьныя падручнікі, у якіх увесь матэрыял па мове выкладаецца даволі сістэматычна, а лінгвістычныя з'явы і факты прыводзяцца ў іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. Зараз у кнігарнях можна знайсці дзесяткі дапаможнікаў, адрасаваных абітурыентам. З гэтай мэтай створаны серыі дапаможнікаў па тых ці іншых напрамках. Усе яны, безумоўна, могуць аказаць карысць у падрыхтоўцы да іспытаў, бо ў сваёй сукупнасці накіраваны на ўдасканаленне моўных ведаў, сістэматызацыю і абагульненне вывучаных матэрыялаў, выяўленне прабелаў у ведах. Іншая справа, што многія з іх ствараліся паспешліва. І даволі часта ў іх можна выявіць лішнія пытанні, не зусім карэктныя іх фармулёўкі. Таму ўвагу неабходна звярнуць на тыя дапаможнікі, якія праверана вопытам, перавыдаваліся некалькі разоў і зацверджаны Міністэрствам адукацыі. Абапіраючыся на ўласны вопыт, хацелася б рэкамендаваць кнігі, якія выдадзены Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Усе яны максімальна прыбліжаны да тэстаў, якія здаваліся ў мінулым годзе, і ў поўнай ступені адлюстроўваюць узроўні складанасці, практычную напоўненасць і тэарэтычную скіраванасць заданняў.

Аналіз цэнтралізаванага тэсціравання дазваляе зрабіць высновы аб найбольш складаных заданнях і тых сітуацыях, дзе абітурыенты найбольш часта рабілі памылкі. На гэтыя тыпы заданняў неабходна звярнуць асобую ўвагу.

Так, па беларускай мове найбольшы працэнт няправільных адказаў выяўлены пры выкананні такіх тэм, як напісанне літары я ў словах г..роіка, зац..мна, жыцц..ўстойлівасць, по..с, зерн..склад (толькі 5,68 % правільных адказаў), вызначэнне ў словах прыстаўкі і суфікса (7,31% правільных адказаў), вызначэнне ў сказах азначэння (15,26 % правільных адказаў), вызначэнне слоў, у якіх вымаўленне не супадае з націскам (17,09 % правільных адказаў), вызначэнне націскных галосных (17,28 % правільных адказаў). Выклікалі пэўную цяжкасць правапіс і, й, ы пасля прыставак, вымаўленне пэўных слоў і іх формаў, вызначэнне марфем слова, правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў, прыслоўяў, не (ня) з рознымі часцінамі мовы і інш. Парадавала правільнае выкананне заданняў, звязаных з правапісам апострафа (62,5 % правільных адказаў), чаргаваннем зычных у месным склоне (56 % правільных адказаў), напісаннем літары е ў форме меснага склону адзіночнага ліку (54,91 % правільных адказаў), вызначэннем прыметнікаў, якія не маюць формаў ступеняў параўнання (46,21 % правільных адказаў) і інш.



Фота БЕЛТА

Па рускай мове вялікая колькасць памылак назіралася пры вызначэнні нескланяльных займеннікаў (5,6 % правільных адказаў), вызначэнні будовы слова па прымеце прыстаўка + корань + суфікс + суфікс + канчатак (8,5 % правільных адказаў), па расстаноўцы знакаў прыпынку ў складаных сказах (у асобных выпадках толькі 8,6 % правільных адказаў), афармленні сказаў з простай і ўскоснай мовай (12,7 % правільных адказаў), пастаноўцы двукроп'я (15,6 правільных адказаў) і інш. Не заўсёды абітурыенты правільна адказвалі на пытанні, звязаныя з агульнымі звесткамі пра мову і культурай маўлення, вызначэннем граматычных формаў, пастаноўкай знакаў прыпынку ва ўскладненых і складаных сказах і інш. Для значнай колькасці абітурыентаў не выклікалі цяжкасцяў такія заданні, як напісанне літары і ў суфіксах і канчатках назоўнікаў і прыметнікаў (63,4 % правільных адказаў), правапіс раздзяляльнага цвёрдага знака (51,6 % правільных адказаў), правапіс ы пасля ц (41,8 % правільных адказаў) і інш.

Народная мудрасць сцвярджае, што лепш вучыцца на ўласных памылках. Таму ў апошнія дні падрыхтоўкі да тэсціравання (а часу засталося вельмі мала) лепш звярнуца да выданняў, у якіх праводзіцца аналіз тыповых памылак і каментарыі да адказаў. Гэта дазволіць сканцэнтравацца на найбольш слабых для абітурыента месцах і актывізаваць працу ў правільным накірунку.

**Васіль СТАРЫЧОНАК,**
**доктар філалагічных навук,**
**дэкан факультэта рускай**
**філалогіі БДПУ імя М. Танка.**

# З любоўю да дзяцей



Яшчэ не мінула года, як у Віцебску створаны, а дакладней атрымаў другое нараджэнне дзяржаўны гарадскі цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі для дзяцей з цяжкімі парушэннямі развіцця. Насамрэч гэта цёплы і ўтульны дом, куды віцебскія матулі штораніцы прыводзяць сваіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Тут шмат прыгожых цацак, выдатнае фізкультурна-аздараўленчае абсталяванне і мэбля, з густам спраектаваныя памяшканні для заняткаў і сну. Гэты надзвычай дарагі праект, створаны па самых сучасных еўрапейскіх стандартах, здзейсніўся пры непасрэднай падтрымцы дабрачыннай арганізацыі «Карытас» з аўстрыйскага горада Лінца. Але галоўнае — у гэтай не зусім звыклай для многіх установе працуе каманда прафесіяналаў — педагогі, выхавальнікі, псіхолагі, якія штохвілінна саграюць душэўным цяплом літаральна кожнага з трыццаці выхаванцаў. Бацькі спакойныя за дзяцей і маюць магчымасць яшчэ больш прысвяціць сябе сям'і і працы. Кіруе Цэнтрам Валянціна Стацэнка — спецыяліст з 42-гадовым педагагічным стажам.

**На здымках:** імгненні аднаго дня, праведзенага фатографам «Звязды» ў гэтым Віцебскім цэнтры.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**





## СТУДАТРАД — У АНАПУ І НЕ ТОЛЬКІ

**З Віцебска адправіўся на работы ў час канікулаў першы студэнцкі атрад, члены якога будуць працаваць у аздараўленчым дзіцячым лагеры ў Анапе Краснадарскага краю.**

Усяго, паводле слоў першага сакратара Віцебскага абкама БРСМ Руслана Вінакурава, гэтым летам плануецца стварыць больш за 140 такіх атрадаў, дзе будуць працаваць каля 5,5 тысячы хлопцаў і дзяўчат.

Будуць таксама створаны валанцёрскія, ваенна-спартыўныя атрады, у тым ліку і для цяжкіх падлеткаў, будаўнічыя маладзёжныя атрады будуць працаваць у аграгарадках. Частка моладзі Віцебшчыны адправіцца працаваць на ўсебеларускую будоўлю спартыўнага комплексу «Мінск-арэна».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ТЫМ, ХТО ЗАРАЗ РЫХТУЕЦЦА ДА ТЭСЦІРАВАННЯ, ХАЦЕЛАСЯ Б ВЫКАЗАЦЬ НЕКАЛЬКІ ПАРАД:

**1.** Не трэба хваляваццa і нервавацца! Будзьце максімальна сабранымі! Уважліва чытайце варыянты адказаў, бо там можа быць змешчана карысная для вас інфармацыя.

**2.** Прачытайце ўважліва заданні тэста. Спакойна абдумайце пытанні, пастаўленыя ў заданні. Помніце, што многія заданні закрытага тыпу дапускаюць не адзін, а два і больш правільныя адказы.

**3.** У хатніх умовах паспрабуйце ўсе заданні выконваць самастойна. Не ведаючы адказу, не спяшайцеся разгортваць старонкі, дзе змешчаны адказы. Звярніцеся да падручніка і паўтарыце адпаведныя тэмы.

**4.** Звяртайце ўвагу на фармулёўку пытанняў і іх ключавыя словы. Адрознівайце падобныя (на першы погляд), але зусім процілеглыя пытанні тыпу «Працяжнік на месцы пропуску ставіцца» і «Працяжнік на месцы пропуску не ставіцца», «Літара а пішацца ў словах» і «Літара а не пішацца ў словах».

**5.** Рацыянальна выкарыстоўвайце час, адведзены на выкананне ўсіх заданняў. Калі ўзнікаюць цяжкасці ў якім-небудзь адказе, прапусціце гэта заданне і пераходзьце да выканання наступнага. Калі застанецца час, вярніцеся да выканання прапушчаных заданняў.

**6.** Галоўнае — цярпенне, развага, настойлівасць, і адказ будзе знойдзены.

**7.** Старайцеся не дапускаць памылак пры запаўненні бланка адказаў.

*Я жадаю ўсім абітурыентам 2007 года поспехаў. Спадзяюся, што вы смела і паспяхова пераадолееце ўсе падводныя рыфы і скалы вялізнага акіяна, які называецца мовай, і зможаце заняць тое неабходнае для вас месца ў шматтысячнай арміі студэнцтва.*

